5. *Завіша, Крыштаф*. Успаміны Крыштафа Завішы / Крыштаф Завіша. – Мінск : Хурсик В., 2011. – 452 с.

6. Касцёл імя панны Марыі // Radzima.org [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.radzima.org/be/minsk/2984.html. – Дата доступу: 14.05.2016.

7. *Мархель, У.* Завіша Крыштоф Станіслаў / У. Мархель // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2005. – Т. 1 : Абаленскі–Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 638.

8. *Насевіч, В.* Завішы / В. Насевіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2005. – Т. 1 : Абаленскі–Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 638–639.

9. *Сыракомля, У.* Мінск / Уладзіслаў Сыракомля ; пер. Х. Лялько // Выбраныя творы / Уладзіслаў Сыракомля ; уклад., прадм., камент. К. Цвіркі. – Мінск, 2010. – С. 320–401. – (Беларускі кнігазбор. Сер. 1. Мастацкая літаратура).

10. *Шыбека, З. В.* Минскъ сто гадоў таму / З. В. Шыбека. – Мінск : Беларусь, 2007. – 304 с.

11. Pamiętniki Krzysztofa Zawiszy, wojewody mińskiego (1666–1721) / wyd. z oryg. rękopismu i opatrzone przypiskami przez J. Bartoszewicza. – Warszawa : J. Zawisza, 1862. – [6], LXXIII, 438, [2] s., [2] k. tabl. : il.

А. І. СМОЛІК

# МЕЦЭНАЦТВА ГРАФСКАГА РОДА ТЫШКЕВІЧАЎ

Чырвоны Двор (літ. Raudondvaris) з'яўляецца адным з найстаражытных помнікаў архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага. Замак узведзены яшчэ крыжакамі ў 1410 г., пасля разгрому Тэўтонскага ордэна стаў уласнасцю караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта Аўгуста, закаханага ў найпрыгажэйшую жанчыну Еўропы Барбару Радзівіл. Кароль нічога не шкадаваў для сваёй каханай, адным з падарункаў стаў палац у Чырвоным Двары. Гэта адбылося за год да іх шлюбу ў 1549 г., але ў 1551 г. Барбара нечакана памерла. Мяркуюць, што была атручана Бонай Сфорца (маці караля), якая не пагаджалася са шлюбам. На працягу двух стагоддзяў уладальнікамі Чырвонага Двара былі Радзівілы, якія будавалі і перабудоўвалі сядзібу ў адпаведнасці з тагачаснымі стылямі. Потым, у XVIII ст. Чырвоны Двор –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласнасць шэрагу магнатаў ВКЛ: Варлоўскіх, Дзевалтоўскіх, Касакоўскіх, Забелаў.

У 1819 г. Чырвоны Двор перайшоў да графа лагойскай галіны Тышкевічаў Міхала, затым – да яго сына Бенядзікта Эмануіла (1801–1866 гг.), які разам з жонкай Вандай Ваньковіч (1808–1842 гг.) паступова пераўтварае Чырвоны Двор у сапраўдны культурны арэал ВКЛ.

У 1830-х гг. Бенядзікт Эмануіл карэнным чынам перабудаваў замак, які быў разбураны падчас паўстання 1830–1831 гг. Таксама былі ўзведзены царква, аранжарэя, два дамы для прыслугі, стайня, ветраны млын, у сядзібе быў закладзены парк. Будынкі ансамбля ўзводзіліся па праектах знакамітых італьянскіх архітэктараў Чэзарэ Анікіні і Франчэска Андрыёлі (бацькі будучага неверагодна таленавітага беларускага мастака і актыўнага ўдзельніка паўстання 1863–64 гг. М. Э. Андрыёлі). Ф. Андрыёлі стварыў унатраны інтэр’ер палацава-паркавага комплекса. Аздабленнем будынкаў ансамбля займаліся таксама пейзажыст, акадэмік жывапісу Альберт Данілавіч Жамет (1821–1877 гг.) і мастак Йонас Баневіч. Для іх культуратворчай дзейнасці Тышкевічы стварылі найлепшыя ўмовы. Менавіта ў гэты перыяд А. Жамет напісаў шэраг знакамітых палотнаў.

Граф Бенядзікт і графіня Ванда, як і ўсе прадстаўнікі тышкевіцкага роду, грунтоўна ведалі гісторыю свайго краю, былі высокаадукаванымі асобамі, выдатнымі знаўцамі еўрапейскай і сусветнай культуры, клапаціліся аб росквіце мастацтва, у тым ліку вылучалі сродкі на падтрымку таленавітых творцаў. Так, А. Д. Жамет атрымаў ад Бенядзікта Эмануіла значную грашовую падтрымку для ўдасканалення майстэрства жывапісу ў Італіі.

Нарадзіўся А. Жамет у Вільні ў сям’і небагатага мяшчаніна. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Віленскай гімназіі, потым у якасці вольнага наведвальніка займаўся ў Пецярбургу ў Імператарскай Акадэміі мастацтваў, дзе пад кіраўніцтвам прафесара М. Н. Вараб’ёва асвойваў тэхніку жывапісу. Бенедыкт Эмануіл сачыў за творчасцю А. Жамета, імкнуўся дапамагчы творцу развіваць прыродныя задаткі і атрыманыя ў акадэміі навыкі, таму прапанаваў таленавітаму мастаку паехаць у Еўропу, каб пазнаёміцца са знакамітымі майстрамі жывапісу і іх творчасцю. На сродкі Тышкевіча мастак 12 гадоў жыў і вучыўся ў лепшых тагачасных пейзажыстаў у Англіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Германіі, Італіі і Францыі. Менавіта там ён стварыў знакамітыя палотны «Краявід возера Нэмі», «Цівалі і яго вадаспады», «Краявід Рока-ды-Папа», «Рымскі Калізей» (за гэта палатно мастак атрымаў прэмію ад рымскай Акадэміі святога Лукі ў 1854 г.). Карціна «Цівалі і яго вадаспады» была высока ацэнена Імператарскай Акадэміяй мастацтваў, за яе А. Жамет атрымаў званне някласнага (свабоднага) мастака. За цыкл твораў, створаных у Еўропе, А. Жамет у 1859 г. атрымаў высокае званне акадэміка. Думаецца, у гэтым ёсць пэўная заслуга яго высакародных мецэнатаў Тышкевічаў. Удзячны мастак падараваў ім свой самы лепшы твор «Рымскі краявід», які аздобіў іх карцінную галерэю. Дарэчы, гаспадары Чырвонага Двара сабралі ўнікальную калекцыю карцін, у якой былі палотны Леанарда да Вінчы, П. П. Рубэнса, Фра Барталамеа, Я. Матэйкі і інш. На жаль калекцыя карцін знікла падчас Першай Сусветнай вайны, магчыма стала ўпрыгожваннем прыватных калекцый.

У 1864 г. славуты мастак А. Жамет звярнуўся ў Вільню, дзе да канца свайго жыцця працаваў дэкаратарам віленскага гарадскога тэатра. Шэраг яго твораў экспануецца ў вядомых мастацкіх галерэях свету, напрыклад, карціну «Арка-Скура і розныя віды вілы Бутэр, у Палерма» можна ўбачыць у Эрмітажы.

Мецэнацтва графа Б. Э. Тышкевіча садзейнічала таксама ўдасканаленню кампазітарскага і выканальніцкага майстэрства аднаго з заснавальнікаў беларускай музычнай культуры Фларыяна Фабіянавіча Міладоўскага (1819–1889 гг.).

З Чырвоным Дваром звязана навуковая, асветніцкая, мастацкая і мецэнацкая дзейнасць унука Бенядзікта Эмануіла – Бенядзікта Генрыка Тышкевіча (1852–1935 гг.), да якога па спадчыне перайшоў палацава-паркавы комплекс. Б. Г. Тышкевіч нарадзіўся (па звестках асобных даследчыкаў) у Лагойску, іншыя лічаць месцам яго нараджэння Немеж, што ў сучаснай Літве. Дакладна вядома, што дзяцінства Бенядзікта Генрыка, які ў раннім узросце застаўся сіратой і выхоўваўся дзядзькам, прайшло ў Чырвоным Двары, што наклала адбітак на яго будучую інтэлектуальную дзейнасць. Справа ў тым, што ў Тышкевічаў была цудоўная бібліятэка і хлопчык рана палюбіў кнігі, асабліва захапляўся творамі аб вялікіх геаграфічных адкрыццях і экзатычных краінах. Пад уплывам літаратуры ў яго выспявала трыва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лае імкненне здейсніць вандроўку на іншыя кантыненты. Першая краіна, якую Бенядзікт у дзяцінстве наведаў разам з дзядзькам, была Францыя. Падарожжа па гістарычна-культурных помніках Францыі ўмацавала яго мару. Як толькі Б. Г. Тышкевіч дасягнуў паўналецця і змог самастойна распараджацца фінансавымі сродкамі ён пачаў ажыццяўляць сваю мэту.

Напачатку вандроўнік наведаў Германію і Італію, але няўрымслівага графа больш вабілі краіны Азіі, Амерыкі, Афрыкі, таму Бенядзікт Генрык вырашыў набыць уласную яхту, за якой у 22-гадовым узросце адправіўся ў Бостан (ЗША). Невядома чаму малады граф не здолеў набыць там судна, але вярнуўся ён з падарожжа з жонкай, дачкой будаўніка яхтаў Альжбетай-Кларай Банкрофт. Сваю мару аб яхце Тышкевічы не пакінулі і вырашылі пабудаваць яе па ўласным праекце на судабудаўнічай верфі ў Гаўры (Францыя) [5, с. 68]. У 1875 г. ён стаў уладальнікам судна «Жамойція». Дарэчы, на Сусветнай выставе ў Парыжы (у яе гонар была пабудавана Эйфелева вежа) яхта і яе ўладальнік атрымалі залаты медаль. На ўласныя сродкі Бенядзікт Генрык здзяйсняя шэраг марскіх археалагічных экспедыцый у Індыю, Кітай і Японію, з якіх былі прывезены вельмі каштоўныя для навукі археалагічныя калекцыі, а таксама мноства фотаздымкаў.

Паспяховыя марскія экспедыцыі выклікалі ў Бенядзікта Тышкевіча жаданне здейсніць марское падарожжа вакол свету, да якога ён пачаў старанна рыхтавацца. Планы мужа заўсёды падтрымлівала і графіня Альжбета-Клара, якая ахвяравала на экспедыцыі значную частку асабістых сродкаў. І вось граф засвоіў навігацыйныя інструкцыі, пазнаёміўся з месцам знаходжання маякоў свету, набыў неабходнае абсталяванне, падабраў экіпаж з 40 вопытных мараходаў і адправіўся ў кругасветнае падарожжа. Але ў гэты час пачаўся руска-турэцкі канфлікт, і экіпаж «Жамойціі» туркамі ўспрымаўся як варожы. Таму, наведаўшы Крым і Алжыр, граф вымушаны быў спыніць падарожжа [1].

Б. Тышкевіч не толькі вандраваў сам, але садзейнічаў здзяйсненню марскіх падарожжаў іншымі. Напрыклад, ён аказаў фінансавую і арганізацыйную дапамогу яхтсмену С. Рагазінскаму, які ажыццявіў першую польскую марскую навуковую экс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педыцыю. Падарожнік у знак удзячнасці назваў імем Тышкевіча возера Мбу ў Камеруне [5, с. 68].

Падчас экспедыцый Бенядзікт Генрык захапіўся авангардным для таго часу фотамастацтвам, якое пасля марскіх вандровак стала яго другім азартам. Тым больш, што графа неўзабаве напаткала бяда: заўчасна памерла горача каханая жонка. Неабходна была займацца выхаваннем траіх дзяцей. У дадатак да ўсяго пачалі адчувацца фінансавыя праблемы. Граф вырашае спыніць вандроўкі па свету і прысвяціць сябе новай справе. У адрозненне ад сваіх продкаў, якія ў вандроўках рабілі замалёўкі з натуры ці запрашалі мастакоў з эцюднікамі, Бенядзікт захоўваў цікавыя назіранні фотааб’ектывам. Ужо ў 1876 г. яго фотаработы выстаўляліся на выставе ў Філадэльфіі.

Б. Тышкевіч пераязджае на Лагойшчыну і пасяляецца ў маёнтку Вялае. Маючы высокі эстэтычны густ, ён пераўтварае некалі сціплы паляўнічы домік у Налібоцкай пушчы ў графскую сядзібу. Значную частку дома займалі сапраўдная фотастудыя і фотаархіў. Граф становіцца своеасаблівым фотарэпарцёрам, фатаграфуе знакамітых дзеячоў беларускай навукі, мастацтва і аб’екты духоўнай і матэрыяльнай культуры. Б. Тышкевіч зрабіў шмат замалёвак паўсядзённага жыцця і партрэтаў беларускіх сялян. Прысвечаныя ім кадры пастановачныя, у іх вачах адчуваецца своеасаблівая ментальнасць, адметны этас. Здаецца, нішто не выпадала з поля зроку фатографа: побыт розных сацыяльных груп беларускага грамадства, іх заняткі, адзенне, інтэр’ер жылля, народны касцюм, вольны час і г. д. Захаваўшыяся фотаработы сведчаць аб прафесіяналізме графа і могуць быць аднесены да культурна-гістарычнай каштоўнасці. Гэта меркаванне пацвярджаюць залатыя медалі, якія атрымаў Б. Г. Тышкевіч за свае шэдэўры на выставах у Польшчы (1894 г.) і Берліне (1899 г.).

Маёнтак Вялае не абмінулі Першая і Другая сусветныя войны. Ад яго захаваўся толькі будынак фоталабараторыі, які знаходзіцца ў страшэнным запусценні. Фотаархіў быў знішчаны. Але ў 1993 г. нечакана ў аднаго з французскіх антыквараў знойдзены фотаальбом з 86 вельмі якаснымі фотаздымкамі Б. Г. Тышкевіча. Іх, як мяркуюць даследчыкі, граф прывёз у Францыю, дзе пражыў апошнія гады жыцця. Альбом набыло французскае Таварыства сяброў музея Нісефора Ньепса (які лі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыцца заснавальнікам фатаграфіі). У 1999 г. копіі фотаздымкаў, зробленых на беларускай зямлі, выстаўляліся ў Вільні і Коўна. Падчас экспанавання рэдкіх фоташэдэўраў літоўцы стварылі каталог выставы. Беларускія фотааматары пабачылі калекцыю работ Б. Г. Тышкевіча толькі ў 2009 г., якая экспанавалася ў Нацыянальным музеі гісторыі Рэспублікі Беларусь з нагоды 170-годдзя вынаходніцтва фатаграфіі. Яе арганізатарамі былі Амбасада Францыі ў Рэспубліцы Беларусь і Беларускае грамадскае аб'яднанне «Фотамастацтва».

Такім чынам, беларусы праз 100 гадоў атрымалі магчымасць пазнаёміцца з творчай спадчынай свайго славутага суайчынніка. Вельмі шкада, што не быў створаны каталог фотаэкспанатаў, як гэта зрабілі нашы суседзі. Таму, калі хтосьці зацікавіцца альбомам, можна паехаць у Чырвоны Двор, які рэстаўраваны і знаходзіцца ў якасным стане, дзе экспануюцца многія шэдэўры Б. Г. Тышкевіча альбо ў Вільню і Коўна. У рэшце рэшт не надта далёка і Францыя.

Знаёмства з культурна-асветніцкай дзейнасцю прадстаўнікоў графскага роду Тышкевічаў сведчыць, што пераважная большасць з іх прытрымліваліся асноўнага прынцыпа мецэнацтва, сфармуляванага ў XVI ст. Францыскам Скарынай. Асветнік-гуманіст заклікаў пануючыя колы аддаваць сябе цалкам і поўнасцю «розмножению мудрости, умения, опатренности, розуму и науки», не шкадуючы «всякого тружания и скарбов» [3, с. 135]. Канстанцін і Яўстах Тышкевічы ў 1856 г. ахвяравалі Віленскаму музею старажытнасцей уласную бібліятэку (3 тыс. кніг), археалагічную калекцыю з 2 тыс. адзінак. Браты на ўласныя сродкі пабудавалі чатыры судны для навуковай экспедыцыі ўздоўж ракі Віліі, падчас якой былі сабраны багатыя этнаграфічны, фальклорны і археалагічны матэрыялы.

На сродкі Юзафа Тышкевіча ў Валожыне ў 1815 г. быў узведзены мураваны велічны касцёл святога Юзафа ў стылі класіцызму. Ён жа быў фундатарам Валожынскага палаца, помніка архітэктуры класіцызму. Касцёл і палац да сённяшняга часу з'яўляюцца галоўнымі планіровачнымі элементамі горада.

У Лагойску Тышкевічы пабудавалі 2 уніяцкія і 2 праваслаўныя царквы, Аляксандр і Вікенцій Тышкевічы на працягу шасці гадоў (1787–1793 гг.) фінансавалі будаўніцтва мураванага касцёла Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі і святога



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Казіміра. Уладальнікамі Лагойска заснаваны фабрыкі льняных і бавоўнавых вырабаў, ліцейнае прадпрыемства, шкляны і цукровы заводы, крэдытны банк.

Мецэнатамі з'яўляліся і Тышкевічы, якія гаспадарылі ў Свіслачы. Тадэвуш, Казімір і Вікенцій на працягу XVII–XVIII стст. ператварылі невялікае мястэчка ў сапраўдны прамысловы і культурны цэнтр. У ходзе рэканструкцыі ў Свіслачы з'явілася рыначная плошча з фарным касцёлам, уніяцкай царквой, вежай з гадзіннікам і «кафэнгаўзам». Графам Вікенціем былі закладзены парк і заапарк. У 1880-х гг. узведзены будынак для тэатра, дзе ставіліся балеты і музычныя сцэны. Усе прафесійныя трупы, якія прыязджалі ў Свіслач, В. Тышкевіч браў на сваё ўтрыманне, плаціў акцёрам грошы, лепшых узнагароджваў каштоўнымі падарункамі.

У 1805 г. В. Тышкевіч на свае сродкі заснаваў у Свіслачы гімназію, якую ў розныя часы скончылі С. Горскі, Ю. Крашэўскі, Н. Орда, Р. Траўгут. Гаспадар Свіслачы вылучыў для гімназіі 1000 злотых і будынкі, на яе развіццё завяшчаў 30 тыс. рублёў срэбрам. Граф матэрыяльна падтрымліваў настаўнікаў, якім не хапала пакояў у будынках гімназіі, выдзяляючы ім грошы на наёмнае жыллё. Бяднейшыя навучэнцы таксама атрымлівалі дапамогу для найму пакояў. З графскага маёнтку ў гімназію пастаўлялася паліва [4, с. 47–48].

Гістарычны вопыт развіцця айчыннай культуры сведчыць, што яе высокі ўзровень дасягнуты ў мінулыя стагоддзі дзякуючы мецэнацкай дзейнасці беларускай магнатэрыі, да якой належылі і прадстаўнікі графскага роду Тышкевічаў. На гэтай высакароднай традыцыі, на наш погляд, павінны адраджацца сучасныя формы мецэнацтва. Прыкладна два працэнты ад дзяржаўнага гадавога бюджэту далёка не задавальняюць сённяшнія патрэбы сферы культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Гловацкий, В.* Увлекательный мир парусов : Очерки по истории парусного спорта / В. Гловацкий ; пер. с пол. Л. Васильева, В. Кона. – М. : Прогресс, 1981. – 312 с.

2. *Капилов, А. Л.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск : Институт современных знаний, 2000. – 144 с.

3. *Конан, У. М.* Скарына (Скарыніч) Францыск [Францішак; 1490 (?) – 1551 (?)] / У. М. Конан, С. А. Падокшын, І. А. Юхо // Мысліцелі

і асветнікі Беларусі : энцыкл. даведнік / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш. ]. – Мінск, 1995. – С. 123–137.

4. *Патоцкі, Л.* Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі ; укл., прадм., камент. А. М. Філатавай ; пер. з пол. І. У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1997. – 207 с.

5. *Сакалова, В. М.* Палац як семіятычны кампанент магнацкай культуры (на прыкладзе маёнткаў Тышкевічаў) / В. М. Сакалова // Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве : Пятыя міжнар. Тышкевіцкія чытанні, Мінск, Крэцінга, 14–15 мая 2014 г. : манагр. зб. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; Kretingos muziejus grafų Tiškevičų dvare. – Мінск, 2014. – С. 57–72.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Н. Е. НОВИК

## СОЗДАНИЕ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ СВИСЛОЧСКОЙ УЧИТЕЛЬСКОЙ СЕМИНАРИИ

Заметный след в истории Свислочского края оставила учительская семинария, основанная в соответствии с Высочайше утвержденным мнением Государственного совета 15 февраля 1875 г., открытая 1 июля 1876 г. и действовавшая в Свислочи до лета 1915 г. Это была четвертая по счету в пределах современной территории Беларуси учительская семинария Виленского учебного округа.

В дореволюционный период (в отличие от Молодечненской и Полоцкой учительских семинарий) не был написан исторический очерк развития Свислочской учительской семинарии, имелись лишь некоторые сведения о ней в работе Е. Орловского [12]. В современной литературе учебному заведению посвящены небольшие статьи в «Энциклопедии истории Беларуси» и книге «Память» [13, 15], появляются публикации, связанные с деятельностью ее некоторых выпускников [14].

Выбор места для открытия учительской семинарии типичен для подобных учебных заведений, которые обычно располагались в небольших городах и местечках, где имелись подходящие участки земли и помещения. Когда попечитель Виленского учебного округа Н. А. Сергиевский в 1874 г. возбудил ходатайство перед Министерством народного просвещения об от-